Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!



Работніца і калгасніца Беларусі

Выданне ЦККП(б)Б

1 МАЯ

Радасна і шчасліва сустракае вялікі совецкі народ свята міжнароднай пролетарскай салідарнасці—1 Мая. Ёсць чаму радавацца нам—грамадзянам соцыялістычнай радзімы ў гэты знамянальны дзень.

25 год таму назад у першамайскай лістоўцы таварыш Сталін пісаў: «Непатрэбна нам царства буржуа і прыгнятальнікаў. Праклятце і смерць капіталізму з яго жудасцямі жабрацтва і крывапраліццяў! Няхай жыве царства працы, няхай жыве соцыялізм!» Вялікая соцыялістычная рэволюцыя ажыццявіла гэты заклік правадыра. Жыве і мацнее на адной шостай частцы света царства працы! Канчаткова і беспаваротна ў нашай краіне перамог соцыялізм!

Першае Мая ў гэтым годзе совецкі народ адзначае новымі небывалымі ў гісторыі чалавецтва дасягненнямі. Наша свята мы сустракаем новай Сталінскай Канстытуцыяй, якая ўжо дзейнічае на радасць нашым прыяцелям ва ўсім свеце і на страх ворагам. Сталінская Канстытуцыя—гэта дакумент шчаслівага жыцця—дакумент перамогшага соцыялізма. З увядзеннем Сталінскай Канстытуцыі значна ўзрасла актыўнасць народных мас. Канстытуцыя знамяную сабой паварот у палітычным жыцці краіны, які ўзначальвае партыя Леніна—Сталіна.

Грандыёзны нашы поспехі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва. У гэтым годзе паспяхова заканчваецца другая пяцігодка. Па раду важнейшых галін праграма другой пяцігодкі была выканана і перавыканана яшчэ ў мінулым годзе. Шпаркімі тэмпамі рухаемся мы ўперад. Больш 39 мільярдаў рублёў укладваецца ў 1937 годзе ў народную гаспадарку. Больш 26 мільярдаў рублёў асігнуецца на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы, больш 20 мільярдаў рублёў—на абарону краіны. На 20,8 проц. павялічваецца рост вытворчасці прадметаў спажывання—гэта значыць, што мануфактуры, абутку, прадметаў харчавання і т. д. у гэтым годзе стане значна больш.

З кожным днём паляпшаецца наша жыццё. Расце заработная плата рабочага класа, расце заможнасць калгаснікаў. Варта было ў прадсвяточныя дні пабываць на гарадскіх і раённых кірмашах нашай рэспублікі, каб упэўніцца ў вялікім росце добрабыту насельніцтва. Работніцы, калгасніцы, іх мужы і дзеці абзаводзіліся на свята каштоўнейшымі навінкамі.

Адным з самых большых нашых дасягненняў з'яўляюцца выхаваныя партыяй і ўрадам героі і гераіні соцыялістычнай працы. Мы ганарымся адважнымі лётчыкамі—героямі Совецкага Саюза Чкалавым, Байдуковым, Беляковым. Мы ганарымся адважнымі дочкамі Бурат-мангольскай рэспублікі Сункуевай, Хахолавай, Канстантынавай, Тыхеевай і Любімскай, зрабіўшых гераічны пераход Улан-Удэ—Масква. Мы ганарымся нашымі совецкімі піяністамі, вышаўшымі пераможцамі на пятым міжнародным конкурсе піяністаў імя Шопена, у Варшаве. Мы ганарымся совецкімі скрыпачамі, якія атрымалі пяць з шасці першых прэмій на міжнародным конкурсе скрыпачоў імя Ізаі ў Бруселі.

Не мала гераінь і герояў працы штодзённа вырошчваюцца і ў нашай ордэнаноснай Беларусі. На грудзях лепшых дочак нашай рэспублікі зяюць ордэны—гэта вышэйшая ўрадавая ўзнагарода.

Нашы поспехі аграмадны, але яны, як вучыць нас таварыш Сталін, не павінны ўскружыць нам голавы. Лютаўскі пленум ЦК ВКП(б), даклад і заключнае слова тав. Сталіна на пленуме мабілізуюць нашу партыю на барацьбу з зазнайствам, на ўздым рэволюцыйнай пільнасці, на шырокае разгортванне крытыкі нашых недахопаў. Рашэнне пленума—гэта праграма дзеяння для ўсіх большэвікоў партыйных і непартыйных.

Першае Мая мы сустракаем разгортваннем масавай сяўбы. Яна павінна прайсці ў нас пад знакам барацьбы за ажыццяўленне лозунга таварыша Сталіна—дабіцца ў бліжэйшыя 3—4 гады падняцця ўраджайнасці да 7—8 мільярдаў пудоў зярна. Поспех сяўбы, як і іншых сельска-гаспадарчых работ, многа залежыць ад работы жанчын. Шырачэзныя масы калгасніц павінны гэта ўлічыць. Неабходна значна павялічыць рады стаханавак соцыялістычных палёў.

Аграмадны задачы работніц па выкананню народна-гаспадарчага плана 1937 года. Новым, магутным уздымам стаханаўскага руху адзначым 20 год вялікай пролетарскай рэволюцыі.

З вясёлымі песнямі, гордыя за сваю радзіму выйдуць на першамайскую дэманстрацыю гаспадары совецкай зямлі. Рускія і украінцы, туркмены і ўзбекі, беларусы і татары і многія дзесяткі другіх роўнапраўных народаў СССР прадэманструюць яшчэ раз сваю бязмежную адданасць справе Леніна—Сталіна. Яшчэ цясней самкнуць свае рады вакол роднай комуністычнай партыі, вакол любімага правадыра таварыша Сталіна.

Вялікаму Сталіну ад усёй душы падзякуе народ за ўсё сваё радаснае жыццё, за шчаслівае мацярынства ў нашай краіне і дапамогу шматсямейным, за новыя яслі, палацы піянераў, сталінскія школы, за шчаслівае дзяцінства нашых дзяцей.

Гордыя за свае поспехі сустракаем мы свой Першамай. Але мы добра памятаем, што пакуль так свабодна і радасна святкуюць яго толькі ў нас—у Совецкім Саюзе.

У гэтыя дні радасці і свята мы ўсімі сваімі пачуццямі і думкамі з гераічным рэволюцыйным народам Іспаніі, які мужна змагаецца за свабоднае жыццё. Тысячы ахвяр пала на франтах Іспаніі ў барацьбе з крывавымі фашыстамі. Тысячы мужчын, жанчын і дзяцей загінула ад налётаў авіяцыі фашысцкіх піратаў.

Вам, родныя сёстры Мадрыда, Астурыі, Каталоніі, мы шлем сваё пролетарскае прывітанне! Мы памятаем словы таварыша Сталіна, «што вызваленне Іспаніі ад гнёту фашысцкіх рэакцыянераў не ёсць прыватная справа іспанцаў, а—агульная справа ўсяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва».

Першае Мая—свята працоўных усяго свету, рабочы клас і працоўнае сялянства капіталістычных краін сустракаюць яшчэ большым пагор-

шаннем свайго становішча. Бязупынна расце эксплаатацыя рабочага класа. Беспрацоўе—гэты вечны біч пролетарыята—усё разрастаецца. Беспрасветнасць беспрацоўя асабліва адчуваюць на сабе работніцы капіталістычных краін. Колькі чалавечых ахвяр прыносіць з сабой кожны дзень галоднае, жабрацкае жыццё беспрацоўнай жанчыны!

Бязупынна расце дарагавізна на прадметы першай неабходнасці. Фашысты—гэта арганізатары вайны, арганізатары голада. Фашысцкія агітатары заклікаюць народ да «самаабмежавання». Яны заклікаюць хатніх гаспадынь гатаваць абеды без мяса, без тлушчаў, прыдумваючы розныя сурагаты. Нядаўна намеснік Гітлера па кіраўніцтву фашысцкай партыі, Рудольф Гесс, у сваёй прамове сказаў: «Наш лозунг—«гарматы замест масла»—цалкам захоўвае сваю сілу... Ад вас, германскіх жанчын, залежыць настрой вашых мужоў, а, значыць, і настрой усяго германскага народа. Мастацтва хатняй гаспадыні павінна заключацца ў тым, каб гатаваць смачную ежу без мяса, масла і яек. Пры вашых закупках не патрабуйце на рынках таго, чаго няма. Нямецкая хатняя гаспадыня не павінна гараваць з прычыны таго, што нельга дастаць чверткі фунта свініны». Так фашысцкі правадыр адкрыта сам прызнае, што арганізацыя голада неабходна для ажыццяўлення падрыхтоўкі Германіі да вайны. Працоўныя масы Германіі церпяць жудасны тэрар. 225 тысяч чалавек томяцца ў канцэнтрацыйных лагерах і катаржных турмах. За 4 гады фашыстамі забіта 6 тысяч антыфашысцкіх барацьбітоў. У Брэмене нядаўна двое рабочых, затрыманыя ў час правядзення збору грошай на карысць іспанскага народу, тут-жа былі расстрэляны.

Больш чатырох год трымаюць фашысты ў турме правадыра германскай комуністычнай партыі Эрнста Тэльмана. Фашысты разлічвалі, што арышт правадыра нанясе сакрушальны ўдар рэволюцыйнаму руху ў Германіі. Аднак іх надзеі не апраўдаліся. Справа Тэльмана жыве і мацнее сярод працоўных Германіі і ўсяго свету. За вызваленне Тэльмана з фашысцкіх лап змагаецца ўсё прагрэсіўнае чалавецтва. Свабоду Тэльману! Грозным патрабаваннем прагучыць гэты заклік на розных мовах на першамайскіх дэманстрацыях.

Сотні тысяч людзей томяцца ў турмах Японіі і Польшчы, Італіі і іншых капіталістычных краін. Але не ўдасца фашыстам крывавым тэрарам задушыць рэволюцыйны рух. Расце і шырыцца пад сцягам Комуністычнага Інтэрнацыянала адзіны фронт антыфашыстаў ва ўсім свеце. Працоўныя капіталістычных краін у дзень 1 Мая выступяць адзіным пролетарскім фронтам супроць фашызма і вайны.

У шалёнай злобе на нашы дасягненні рыхтуюць фашысты напад на Совецкі Саюз. Яны разам з тройчы праклятымі трацкістамі і правымі адшчапенцамі хочуць адабраць ад совецкага народу яго вялікія соцыялістычныя заваёвы. Памятаючы аб ваеннай небяспецы, совецкі народ яшчэ больш умацоўвае сваю абароназдольнасць.

У дзень 1 Мая маладыя байцы Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі прымуць прысягу на вернасць нашай соцыялістычнай радзіме. Яны па першаму закліку партыі і ўрада гатовы даць дастойны адпор усім, хто пасмее пасягнуць на нашы свяшчэнныя граніцы. І разам з Чырвонай Арміяй, калі толькі патрабуецца, на ахову нашай квітнеючай радзімы стануць многамільённыя масы працоўных жанчын—гарачыя патрыёткі сваёй баць-каўшчыны.

Няхай жыве міжнароднае свята пролетарскай салідарнасці—1 Мая!

Няхай жыве штаб сусветнай соцыялістычнай рэволюцыі—Комуністычны Інтэрнацыянал!

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная Партыя большэвікоў і правадыр сусветнага пролетарыята наш родны таварыш Сталін!

Моладзь менскай шчотачнай фабрыкі імя Крупскай вывучае масавыя песні к пролетарскаму святу—1 Мая.
Фота І. Рабіновіча.

МЫ ПЕРАМОЖАМ!

Артыкул Даларэс Ібаруры (Пасіонарыя) для „Правды"

З першага дня барацьбы іспанскі народ быў упэўнены ў сваёй перамозе над цёмнымі сіламі, якія ўвасаблялі эксплаатацыю, прыгнечанне народа ў мінулым, яго заняволенне і знявагу ў будучым. Гэтыя сілы падняліся, каб накласці на народ ганебнае ярмо фашызма.

— Мы іх пераможам!— так сказаў народ, пачынаючы барацьбу ў першы дзень мяцежа.

— Мы іх пераможам!— так гаварылі вусны, так адчувалі сэрцы.

Дарослыя і дзеці, жанчыны, старыя, якія памятаюць аб мінулых бойках з рэакцыяй, народная міліцыя, усе рэспубліканскія сілы зліліся ў адным імкненні, у адной упэўненасці:

— Яны не пройдуць!

Кожны ўклаў у гэтую барацьбу ўсю сваю душу. Не запамятайце: мы-ж пачыналі бойку без зброі, таму што здраднікі перадалі напярэдадні мяцежа ўсю зброю нашым ворагам.

Не знаходзячыся ў гэтыя дні ў Іспаніі, цяжка, немагчыма ўявіць сабе ўсю ступень гераізма нашага народу.

Мацеры не плакалі, выпраўляючы сваіх дзяцей, якія ішлі, каб сустрэцца са смерцю. Жанчыны патрабавалі ад мужчын афярнай смеласці. Яны лічылі за лепшае быць удовамі герояў, чым жонкамі трусоў.

І ў гэтай страшнай барацьбе, калі людзі, ідучы ў бойку без вінтовак, чакалі, пакуль зброя выпадзе з аслабленых рук забітага таварыша, калі жанчыны, закрыўшы вочы мужам у шпіталях, аддавалі дзяцей на апеку і ішлі з калонай, калі іншыя жанчыны даглядалі і выхоўвалі пакінутых дзяцей, як сваіх уласных, — усе мелі адну мару, адну надзею: надзею на міжнародную салідарнасць і дапамогу.

Але дні ішлі, і дапамога ад

буржуазных дэмакратаў не прыходзіла, хоць мы вядзем смяротную бойку з міжнародным фашызмам, які ўзброены да зубоў і пагражае дэмакратыям ва ўсім свеце. Момантамі мы не бачылі дапамогі ў барацьбе, ад якой часткова залежалі бліжэйшая будучыня ўсёй Еўропы і магчымасць захавання міру. У гэтыя моманты, калі ўжо пачалі канчацца не толькі баявыя прыпасы, але і прадукты харчавання, правакатары імкнуліся пасеяць сумненні ў нашых радах.

Іменна ў гэты час падаспела дапамога ад краіны, далёкай ад нас геаграфічна, але блізкай нам, як сястра,—ад Совецкай краіны.

— Совецкія браты не пакідаюць нас у бядзе!— так кажуць байцы на фронце і іх сем'і ў тыле.

У парыве захаплення і ўдзячнасці яны паўтараюць усім, хто сумняваўся ў магчымасці перамогі:

— У нас будзе дастаткова хлеба. Нашы дзеці атрымаюць малако. Нашы байцы падмацуюцца лішнім кавалкам мяса, таму што жанчыны Совецкага Саюза клапоцяцца аб нас!

Сёстры з краіны соцыялізма! І ўсе вы, таварышы, якія пад кіраўніцтвам вялікага і любімага таварыша Сталіна, пераадолеўшы ўсе небяспекі і цяжкасці, стварылі соцыялістычнае грамадства, — вашы прыяцелі, працоўныя Іспаніі, якія вядуць барацьбу супроць фашызма, шлюць вам палкае, удзячнае прывітанне!

Падбадзёраны вашай дапамогаю, гераічны іспанскі народ запэўняе вас, што не ўпадзе духам у гэтай барацьбе. Фашызм не прарвецца, мы затрымаем і адкінем яго!

Упэўненасць у гэтым падтрымліваецца свядомасцю, што мы не адны, што існуеце вы, совецкія жанчыны. Наша барацьба ўзмацнее і адчайныя атакі ворага будуць адкінуты ад стальной сцяны народнага адзінства.

Гарачае прывітанне рабочым і сялянам Іспанскай дэмакратычнай рэспублікі, якія вядуць гераічную барацьбу супроць фашызма!

ЖАНЧЫНЫ НА ФРОНЦЕ

Гэта была дружынніца, апранутая ў сінюю рабочую блузу. Яна трымала ў руках вінтоўку з такім энтузіязмам, як быццам гэта была не прылада смерці, а прыгожая цацка. У групе вясёлых дружыннікаў, якія з ухмылкай ішлі ў бой і на смерць, яна ішла маўклівая, сур'ёзная і задуменная. У яе вачах гарэў агонь. Гэтыя вочы выражалі нянавісць, непахісную рашучасць і адвагу. Я падыйшла да яе і спытала:

— Адкуль ты?

— З Толедо.

— Чаму пайшла на фронт?

Яна некалькі мінут маўчала, потым адказала:

— Каб змагацца з фашызмам, раздушыць ворагаў працоўных і... адпомсціць за смерць брата.

— Яго забілі?

— Так! Ён быў салдатам і быў комуністам. У пачатку мяцежа яго, як і многіх іншых салдат, хацелі прымусіць выступіць супроць нашых братоў, на барацьбу з рэспублікай Ён адмовіўся, і яны застралілі яго як сабаку. Я прыйшла сюды, каб стаць у рады, на тое месца, на якім стаяў-бы ён, і адпомсціць за яго смерць, паказаць фашысцкім мярзотнікам, што калі мужчыны гінуць, на іх месца становяцца жанчыны. Мы б'емся з такім-жа энтузіязмам, з такой-жа адвагай, як і мужчыны. Ад іх мы навучыліся паміраць. Ці не праўда, таварышы, лепш памерці, чым жыць у фашысцкім пекле, у якім пакутуюць рабочыя іншых краін?

Гэта пытанне, здаецца, яна задала самой сабе, або, правільней, яна адказвала на пытанне, якое ўзнікла з глыбіні яе перажыванняў.

Я распытваю яе таварышоў, хачу ведаць, як яна вядзе сябе ў бойцы. Усе зачараваны ёю. Яна першая ідзе туды, дзе пагражае самая вялікая небяспека, са здзіўляючым спакоем яна рызыкуе сваім жыццём.

Баявая дружынніца!

У яе асобе і ў асобе яе таварышак, якія кідаюць выклік смерці і многія з якіх гінуць, нарадзіліся гераіні ўсёй нашай гісторыі, якія змагаліся за незалежнасць і канстытуцыю,— Сагуанто, Нуманцыя, Ла Вадзілла, Аўгусціна Арагонская, Марыя Піта, Мануэлла Санчэр, Марыана Пінеда. Заўсёды жанчыны адыгрывалі выдатную ролю, падтрымліваючы мужчын у іх барацьбе за свабоду і ўласным прыкладам паказваючы ім, што лепш памерці, чым схіліць галаву перад катамі і прыгнятальнікамі народу.

Гвадарамскія вяршыні, Мадрыд і многія іншыя гарады былі сведкамі гераізму жанчын, якія змагаліся з сільным і магутным ворагам. Жанчыны ідуць на смерць з бадзёрай песняй. Трацячых мужнасць яны падбадзёрваюць і заклікаюць да барацьбы. Так было пад Альто дэ Леон, Сомосіерой і т. д. Гэтыя месцы, палітыя крывёю многіх безыменных герояў, будуць, як незгасаючы агонь, свяціць у гісторыі барацьбы нашай краіны з рэакцыяй.

Традыцыі захоўваюцца, гісторыя паўтараецца. У жанчынах, якія змагаюцца на фронце, якія даюць сваю кроў для ратавання раненых, якія, забываючы на ўласную стомленасць, начамі не сняць каля раненых герояў, уваскрасаюць нашы народныя гераіні, паміраўшыя з заклікам: „Няхай жыве свабода!"

Перад вамі, дарагія таварышы жанчыны, разам з мужчынамі, якія ідуць у бой, схіляюцца ў салюце нашыя сцягі.

Слава вам, жанчыны-антыфашысткі!

Даларэс Ібаруры (Пасіонарыя)

„Дэфанс", 4 верасня 1936 г.

„Ты патрэбны народнай міліцыі". Плакат іспанскага мастака Артэча.

ЗБРОЯ БАРАЦЬБЫ І ПЕРАМОГ

25 год таму назад, 5 мая 1912 года, вышаў першы нумер агульнарускай большэвіцкай газеты «Правда». З года ў год працоўныя нашай краіны адзначаюць гэты дзень, як дзень большэвіцкага друку.

У цяжкія гады для нашай партыі газета «Правда» адыгрывала вялікую ролю ў справе выхавання мас. Простай, зразумелай мовай растлумачвала яна шырокім масам ідэі большэвізма; хутка адклікалася на ўсе здарэнні рабочага жыцця.

Газета «Правда» трымала цесную сувязь з рабочымі масамі. Паліцэйскія праследванні, арышты, канфіскацыі не маглі прымусіць замаўчаць голас «Правды». Паліцыя закрывала газету, а яна пад другой назвай зноў з'яўлялася. Выходзіла яна пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна. Амаль штодзённа Ленін дасылаў у «Правду» свае незабыўныя артыкулы, якія згуртоўвалі масы вакол партыі і арганізоўвалі іх на барацьбу.

Вялікі ўдзел у кіраўніцтве «Правдай» прымаў таксама тав. Сталін. Ён быў не толькі арганізатарам і галоўным рэдактарам яе ў той час, але і аўтарам важнейшых кіруючых артыкулаў.

Заўсёды газета «Правда» праводзіла сваю рэволюцыйную работу, будзіла рабочую масу ў самых глухіх кутках Расіі, звязвала перадавых рабочых з партыяй. Ва ўмовах паліцэйскага тэрара праз газету «Правда» партыя распаўсюджвала дырэктывы, ўмацоўвала ідэйную і арганізацыйную згуртаванасць, адзінства партыйных арганізацый.

Таварыш Сталін ў дзень дзесяцігоддзя «Правды» пісаў: «Яна была не проста газетай, падводзячай вынік поспехам большэвікоў у справе заваявання легальных рабочых арганізацый,—яна была разам з тым арганізуючым цэнтрам, згуртоўваючым гэтыя арганізацыі вакол падпольных ачагоў партыі і накіроўваючы рабочы рух к адной пэўнай мэце». Аграмадны шлях прайшоў большэвіцкі друк з дня выхада першага нумара газеты «Правда».

Пройдзены шлях за 25 год—гэта шлях барацьбы і гіганцкіх перамог. Шлях друку—гэта той самы шлях, які пройдзен усёй нашай вялікай ленінска-сталінскай партыяй, нашым гераічным пролетарыятам. Грандыёзны перамогі нашай партыі і нашай краіны. Грандыёзны перамогі і нашага друку, бо друк—гэта дзецішча нашай вялікай партыі, яе самая вострая і самая моцная зброя. Друк расце разам з усёй партыяй, з усёй краінай.

Наша партыя і яе арганізатары—Ленін, Сталін заўсёды надавалі друку выключнае значэнне. Большэвікі друкаваным словам наносілі ворагу моцнае паражэнне.

У гады падполля партыя большэвікоў пры дапамозе такой вялікай зброі, як друк, разбурала асновы царскага самаўладства.

У гады грамадзянскай вайны, наш друк—газеты, лістоўкі, плакаты—з'яўляліся суровай і страшнай зброяй для сусветнай контррэволюцыі.

У гады бурнага соцыялістычнага будаўніцтва партыя пры дапамозе друку паспяхова арганізоўвала масы на перамогі.

Дзесяткі мільёнаў экземпляраў газет, журналаў штодзённа рассылаюцца ва ўсе куткі Совецкага Саюза. На 86 розных мовах народу нясе наш друк большэвіцкае слова ў масы працоўных. Іх прагна чытаюць совецкія людзі. Комуністычны друк цесна звязан з масамі. Працоўныя любяць сваю газету. Для большасці совецкіх грамадзян газета стала надзённай патрэбай. Працоўныя пішуць мільёны пісем ў сваю газету.

Актыўны ўдзел у рабоце нашых газет, журналаў прымаюць работніцы, калгасніцы,—стахановкі, жонкі рабочых і ІТР. З года ў год расце армія рабселькораў. Яны пішуць шмат пісем ў друк, дзеляцца вопытам сваёй работы, бічуюць і выкрываюць усё нягоднае. Пісьмы працоўных з'яўляюцца адным з лепшых сродкаў самакрытыкі знізу. Задача друку заключаецца ў тым, каб прыток гэтых пісем выкарыстаць для палепшання работы нашых арганізацый.

Штогод у дзень друку—5-га мая, нашы газеты праводзяць агляд сваёй работы, правяраюць, як ажыццяўлёны заветы Леніна, указанні таварыша Сталіна аб большэвіцкім друку.

З года ў год гэтыя ўказанні ўскладаюць на друк усё больш і больш адказныя задачы. Асабліва вялікае значэнне мае друк зараз; зараз, калі соцыялізм у СССР перамог канчаткова і беспаваротна; зараз, калі вялікі народ Совецкага Саюза пераможна завяршае другую пяцігодку—пяцігодку пабудовы бясклясавага соцыялістычнага грамадства; зараз, калі ў краіне прынята новая Сталінская Канстытуцыя—самая дэмакратычная ў свеце.

Прыняцце Сталінскай Канстытуцыі азначае шырачайшае разгортванне совецкай дэмакратыі. Разгортванне дэмакратыі прад'яўляе вялікія запатрабаванні нашаму друку. На друк, як на самы масавы апарат сувязі партыі з народам, кладзецца вялікая адказнасць за ажыццяўленне ў краіне новай Сталінскай Канстытуцыі.

Па новай Канстытуцыі выбары будуць вытварацца на аснове ўсеагульнага, прамога, роўнага і тайнага галасавання. Задача друку—ўсямерна дапамагаць згуртаванню ўсёй многамільённай масы працоўных нашай краіны вакол совецкай улады і нашай партыі.

Новыя задачы друку выцякаюць з гістарычных рашэнняў лютаўскага пленума ЦК ВКП(б), даклада і заключнага слова на пленуме таварыша Сталіна. Аграмадныя задачы, якія зараз стаяць перад усёй партыяй—узначаліць палітычны паварот у краіне, шырока разгарнуць самакрытыку знізу, вучыць масы і вучыцца ў мас—з'яўляюцца неад'емнымі задачамі нашага друку.

Большэвіцкі друк і на новым этапе будзе вастрэйшай зброяй партыі Леніна—Сталіна. У дзень дваццаціпяцігоддзя цэнтральнаму органу Усесаюзнай Комуністычнай Партыі большэвікоў газеце «Правда»—шчырае прывітанне!

ЧЛЕН УРАДУ

У нізенькай закуранай хатцы бабкі Зосі цёмна. Але тут не спяць. Старэйшыя дзеці яшчэ з ранку пайшлі ў суседнюю вёску дагаварыцца на лета пасвіць кароў. Дома засталася толькі маці і 10-гадовая Марыя. Маці з сумам глядзіць праз маленькае вакно на месяц, які кідае халоднае святло на зямлю, на іх бедную хатку. Па твары маці папаўзлі слёзы.

— Ты ўжо, дачушка, не маленькая,—шапатам, праз слёзы прагаварыла маці.—Час прышоў узяцца за работу, зарабляць сабе хлеб. Заўтра я завяду цябе ў Вольберавічы і папрашу, каб узялі пасвіць кароў. Будзеш слухаць і рабіць, што скажуць. За гэта цябе будуць карміць і на зіму пашыюць світку. Толькі трэба слухаць гаспадара, бо калі не зробіш чаго-небудзь, ён не заплаціць нічога і ніхто за нас не заступіцца...

Так успамінае Марыя Гурыновіч вясну 1914 года, калі пачалося яе самастойнае батрацкае жыццё. Беднасць і голад прымушалі ісці ў батракі. Акрамя маленькай гнілой хаткі і аднаго гектара зямлі ў гаспадарцы нічога не было. А сям'я была з 10 душ.

— Цяжка жылося нам. Горкім быў батрацкі хлеб,—успамінае цяпер Марыя.—Прыходзілася працаваць ад цямна да цямна. Жанчын тады, наогул, за людзей не лічылі. Яшчэ цяжэйшым быў лёс жанчыны-батрачкі.

Кастрычнік 1917 года прынёс Марыі, як і ўсім працоўным жанчынам, новы лёс, новае шчасце, новае жыццё.

Сям'я бабулькі Зосі стала працаваць на сваёй зямлі. Праз некаторы час з дапамогаю дзяржавы набылі карову, каня, сельскагаспадарчы інвентар. Але Марыя ў аднаасобнай гаспадарцы не бачыла поўнага шчасця. У 1925 годзе яна, разам з іншымі беднякамі і сераднякамі сваёй вёскі, уступіла ў арцель па сумеснай апрацоўцы зямлі. Гэтым быў пакладзен пачатак калектыўнай працы.

На месцы былога маёнтка пана Вайтковіча зараз вырас калгас-гігант „Чырвоны касар". У калгасе Марыя паказвала ўзоры ўдарнай работы. Калгаснікі пасылалі яе працаваць туды, дзе былі прарывы.

Коні былі ў дрэнным становішчы. Агульны сход рашыў паставіць Марыю старшым конюхам. Яна сама даглядала 12 коней і сачыла за работай астатніх конюхаў. Хутка ўсе недахопы былі выяўлены і знішчаны. Марыя дабілася таго, што іх коні сталі лепшымі ў сельсавеце. За ўдарную работу яе пасылалі на Усебеларускую нараду стаханаўцаў жывёлагадоўлі. Там яна атрымала грамату ЦВК БССР.

Хутка Марыю Гурыновіч, як лепшую калгасніцу-актывістку, абралі старшынёй прымежнага калгаса „Ленінскі шлях", Бярозкаўскага сельсовета.

Ужо два гады, як былая батрачка Марыя Гурыновіч кіруе калгасам. Працуючы па Сталінскаму статуту сельскагаспадарчай арцелі, калгас вышаў у перадавыя і дабіўся поспехаў у павышэнні ўраджайнасці, у палепшанні матэрыяльных умоў калгаснікаў.

За гэтыя гады значна выраслa калгасная ферма. У 1934 годзе на ферме было толькі 28 галоў буйнай рагатай жывёлы. Зараз на ферме 107 кароў. Аўцагадоўчая ферма расшырылася на 55 галоў.

Толькі за апошні год калгас пабудаваў дзіцячыя яслі, сенавал, канюшню, некалькі хлявоў і кузню. Калгаснікі вядуць упартую барацьбу за павышэнне ўраджайнасці калгасных палёў.

Як лепшага старшыню калгаса, працоўныя Бягомельшчыны двойчы пасылалі Марыю на Усебеларускі З'езд Советаў. На XI Усебеларускім З'ездзе Советаў Гурыновіч абралі членам ЦВК БССР, а на Надзвычайным XII З'ездзе, у ліку лепшых людзей Совецкай Беларусі, яна зацвердзіла новую Канстытуцыю БССР, Канстытуцыю радаснага і заможнага жыцця.

— Удзельнічаць у кіраўніцтве дзяржавай,—гаворыць тав. Гурыновіч,—жанчыне дадзена права толькі ў нашай совецкай краіне, якой кіруе і вядзе ад перамогі да перамогі любімы ўсім народам наш родны таварыш Сталін. Гэта найвялікшае права замацавана назаўсёды ў новай Сталінскай Канстытуцыі. Мяне выхавала комуністычная партыя. І я прыкладу ўсе намаганні, каб у другім стаханаўскім годзе дабіцца рэкорднага ўраджаю па ўсіх культурах, каб апраўдаць давер'е нашай партыі і правы, дадзеныя Сталінскай Канстытуцыяй совецкай жанчыне.

Бягомельскі раён. **С. Бачура.**

Дэлегаты ўсебеларускай нарады стаханаўцаў—перадавікоў сельскай гаспадаркі. НА ЗДЫМКУ (злева направа): ордэнаносцы—знатныя людзі Совецкай Беларусі тт. Каўдзерка і Селязнёва. Фото Я. Салавейчыка.

НА ДАЛЁКІ УСХОД

На Далёкім Усходзе, воляй навіай радзімы, воляй нашай партыі, у глушы лясоў, дзе яшчэ нядаўна вандравалі толькі мядзведзі, зараз вырастаюць гарады і пасёлкі, пракладваюцца дарогі, узнікаюць несакрушальныя бетонныя крэпасці—фарпосты соцыялізма на Ціхім акіяне. Там нашы сёстры—далёкаўсходніцы, разам са сваімі мужамі, братамі—мільёнамі мужных людзей вядуць гераічную барацьбу з непраходнай тайгой. Яны пакараюць горы, лясы, балоты, рэкі і суровы клімат.

Аб гэтай гераічнай барацьбе мы даведаліся з пісьма Валенціны Хетагуравай к дзяўчатам Совецкага Саюза. Гэта пісьмо мы з вялікім захапленнем і радасцю чыталі некалькі разоў. І кожны раз нас ахоплівала ўсё большае жаданне паехаць на Далёкі Ўсход, жыць там і працаваць. Мы таксама хочам быць актыўнымі ўдзельніцамі перабудовы гэтага цудоўнага краю.

Студэнткі Растоўскага воднага тэхнікума, парашутысткі Марыя Чаплінская і Любоў Рыжэнікава праходзяць практыку на вучэбным судне „Вега", у Марыупальскім парту.

Неўзабаве тт. Чаплінская і Рыжэнікава будуць штурманамі дальняга плавання. (С. Ф.)

Валя Хетагурава ў сваім пісьме пісала: „Але памятайце, на Далёкі Ўсход мы завем толькі смелых, рашучых людзей, якія не баяцца цяжкасцей. Мы ведаем, што нашымі юнакамі і дзяўчатамі ўладае высокая зайздрасць, зайздрасць да ўсяго гераічнага, хай цяжкага. Усё тое, што цяжка, але карысна для нашай радзімы, тое ганарова"...

Хетагурава права ў сваіх папярэджаннях. Мы добра ведаем, што кожная ўпартая барацьба не праходзіць без цяжкасцей. Але мы молады і здаровы. І таму нас не пужаюць ніякія цяжкасці. Мы гатовы аддаць усе свае сілы і здольнасці на карысць нашай радзімы.

Мы—агратэхнікі і лабаранткі ўсесаюзнага даследчага Балотнага Інстытута. Далёкаўсходні край адчувае патрэбу і ў нашай кваліфікацыі, бо ён багаты непраходнымі балотамі, якія можна ператварыць у пладародныя палі і атрымліваць багатыя ўраджаі.

Жывучы недалёка ад Заходняй граніцы, мы ўлічваем блізасць ворага і актыўна ўдзельнічаем у абароннай рабоце. Здалі нормы на значкі СПХА, ГСА першай ступені, а зараз рыхтуемся да здачы норм на значкі другой ступені.

На Ўсходняй граніцы мы таксама прымем самы актыўны ўдзел у абароннай рабоце. Мы будзем вернымі памочнікамі нашай доблеснай Чырвонай арміі, якая пільна ахоўвае свяшчэнныя і недатыкальныя Далёкаўсходнія граніцы.

Мы не можам дачакацца адказа на наша пісьмо, якое паслалі ў адрас Далёкаўсходняга Крайкома комсамола. Хочацца як мага хутчэй паехаць у гэты далёкі, пакуль што невядомы край, і па-баявому ўключыцца ў яго бурнае жыццё і плённую работу.

Мы запэўняем усіх дзяўчат, што там мы будзем вучыцца і вучыць другіх будаваць культурнае, шчаслівае і радаснае жыццё.

Заклікаем вас, дзяўчаты ордэнаноснай Совецкай Беларусі, паследваць нашаму прыкладу!

Аня Акола, Тоня Абраменка, Ліда Гендліна, Люба Шмідт.

Менск.

КУЛЯМЁТЧЫЦЫ

Начальнік Менскага стралковага ціра тав. Фрэйтаг знаёміць работніц тэлеграфа тт. Бурымскую і Аляксееву з матэрыяльнай часткай кулямёта „Максім".
Фота Мазелева

Дзве прафесіі, і з іх адна ваенная—перасталі быць рэдкасцю для нашых дзяўчат... Мы прывыклі іх бачыць за рулём аўтамабіля, за ручкамі кіравання самалёта, на лініі агню з вінтоўкай, на кані за пераадаленнем перашкод... Але і ў ваеннай справе былі спецыяльнасці, здавалася, недаступныя жанчынам. Палохаў сваёй складанасцю кулямёт... 500—600 куль у мінуту... Грубая і дакладная наводка..., 60 кілограм вагой... Не, гэта, бач, не жаночых рук справа... Так думалі.

Анка з гераічнага фільма „Чапаеў" здавалася выключэннем. Памятаеце, з якім захапленнем яна пачала навучацца стральбе з кулямёта ў Пецькі—ад'ютанта Чапаева. Спачатку і Пецька не па-сур'ёзнаму падыходзіў да вучобы.

— Гэта, бач, шчочкі,—паказвае ён на адну з частак кулямёта. А сам заліваецца: паверыць ці не паверыць?

Анка хутка асвоіла дзіўную тэхніку стральбы з „Максіма", і неўзабаве, пасля адной з схваток з белапагоннай афіцэрскай зграяй, калі яна здорава пакасіла яе з кулямёта, сам Васілій Іванавіч Чапаеў пахваліў маладую кулямётчыцу...

Не многа было ў тыя гады такіх як Анка, цяпер іх тысячы.

...Надзя Аляксеева—дзяўчына з доўгімі русымі косамі, ледзь скончыць работу—спяшаецца ў сад „Профінтэрн". Куды-ж гэта цягне Надзю? Няўжо спатканне?.. Таварышкі Надзі—дзяўчаты-звязісткі зацікавіліся, пачалі распытваць.

— Надзенька, куды ты ўсё спяшаешся пасля работы?

— А вось пойдзем разам са мной, паглядзіце...

З гэтага часу дзесяць дзяўчат-звязістак Менскай паштова-тэлеграфнай канторы амаль штодзённа, пад вечар, сустракаліся ў клубе варашылаўскіх стралкоў.

Надзя не дарма амаль кожны вечар прыходзіла ў стралковы клуб. Яна выкатвала на сярэдзіну пакоя вучэбны кулямёт, пакрыты чорным лакам, знімала са сцяны наглядны плакат, дзе былі ў падрабязнасцях абазначаны ўсе дэталі кулямёта, і падоўгу завучвала часці, прыпамінала іх назначэнне, разбірала, зноў збірала.

Асабліва прышлося павазіцца з замком. З напружаннем глядзела яна як інструктар гуртка, меткі куламётчык тав. Шлепкін, адну за другой разнімае часці замка.

— Гэта вось остаў яго, а гэта грэбень. Памятайце—грэбень. Пад'ёмныя рычагі для хаджэння баявой лічынкі, ударнік з байком. Паўтарыце.

Спачатку збянтэжылася, збілася, пераблытала, а ўжо ў наступны раз без запінкі назвала дзесяткі часцей кулямёта, сама разабрала замок, сама і сабрала.

... У Іспаніі, абараняючы незалежнасць сваёй радзімы, плячом к плячу з мужчынамі займаюць сваё месца ў акопах слаўныя дзяўчаты, мацеры, жонкі, сёстры—гераіні іспанскага народу. Усе цяжары франтавога жыцця адважна і стойка яны нясуць на сваіх плячах. Нішто не можа зламіць іх волі. Дзяўчаты Іспаніі—вельмі добрыя стралкі, і ёсць сярод іх не мала меткіх куламётчыц.

Надзя Аляксеева і яе таварышкі вельмі добра ведаюць аб подвігах сваіх далёкіх зарубежных сясцёр.

— Вы пытаеце ў мяне, чаму я вучуся страляць з кулямёта, чаму не задавальняюся адной вінтоўкай? Стральба з кулямёта--гэта дзесяць і больш вінтовак адразу... Я люблю страляць з вінтоўкі, я ніколі не забуду той радасці, якая ахапіла мяне пры першым трапным выстрале. Калі я навучуся метка страляць з „Максіма", мае рукі, маё пільнае вока будуць удвая, калі не ўтрая карысней любімай радзіме.

Многа дзяўчат хочуць навучыцца страляць з кулямёта. Спачатку ўсіх іх бяруць на іспыты,—ці не баяцца яны гуку выстрала, ці не міргаюць вачыма пры стральбе, ці не дрыжаць у іх рукі. Большасць дзяўчат беззаганна праходзяць усе гэтыя іспыты.

Маладыя кулямётчыкі і кулямётчыцы нядаўна былі на першай практычнай стральбе.

Гэта былі ўрачыстыя мінуты.

— Да кулямёта!—пачулася кароткая, дзейсная каманда, і маладыя кулямётчыкі хутка занялі свае нумарныя месцы. Першы нумар злева, другі справа.

Часта б'ецца сэрца. Хваляванне стрымлівае дыханне. Але вось чуецца загад:

— Па грудной цэлі! 300 метраў, пяццю патронамі! Агонь!

Трашчыць кулямёт, захліпваецца. Бліскае агонь. Паўзе лента.

У дзяўчат вочы разгарэліся, з напружаннем яны сціскаюць рукаяткі кулямёта і ўмела водзяць імі з боку ў бок.

Ганаровая справа быць кулямётчыцай! Іх многа цяпер, па прыкладу адважнай Анкі, навучаюцца ў стралковых клубах, гуртках. У адным Менску каля двух дзесяткаў такіх гурткоў, а гэта-ж толькі пачатак.

Слаўныя дзяўчаты нашай краіны! Яны лічаць сваім доўгам гонару мець дзве прафесіі. Адна з гэтых прафесій—перамога адбіць і разграміць ворага на той тэрыторыі, адкуль ён адважыцца на нас напасці.

Е. Садоўскі. 7

ШЧАСЛІВАЕ ,Д



Калгасніца калгаса імя Блюхера тав. Храмцавая прынесла ў яслі сваю дачку Алю.



Урок лепкі ў Барысаўскім дзіцячым садзе.

Маю Ягораву маці прынесла ў Лепельскую кансультацыю. За 15 дзён яна прыбавілася ў вазе на 1 кілограм 50 грамаў.

Тамара Гарэлік лепшая танцаўшчыца сярод дзяцей соўгаса імя 10-годдзя БССР

ЕДЗЯЦІНСТВА!



Школьніцы-выдатніцы 6-й польскай школы ў Менску—Кавалеўская, Варэнік і Більдзюкевіч.

Вучаніцы старшых класаў 1-ай Магілеўскай школы выконваюць танец „Тройка".

Даравітыя дзеці Бабруйскай музычнай школы: Вульф Фіш, Ізя Эпштэйн, Яня Раскін, Іма Ліўшыц.

Дзеці на прагулцы ў Менскім гарадскім садзе.

За сталінскі ўраджай

З усіх канцоў ордэнаноснай рэспублікі з'ехаліся ў Менск майстры высокіх ураджаяў—лепшыя людзі калгаснай вёскі. Старшыні калгасаў, брыгадзіры, звеннявыя і стаханаўцы соцыялістычных палёў прыехалі, каб падзяліцца вопытам сваёй работы за мінулы год, падвесці вынікі спаборніцтва з Заходняй вобласцю, і каб разам з кіраўнікамі партыі і ўраду параіцца, як лепш правесці барацьбу за высокі ўраджай у другім стаханаўскім 1937 годзе.

Стаханаўцы соцыялістычных палёў расказалі, як на аснове правільнай арганізацыі працы, шырокага ўжывання агратэхнікі ва ўмовах неспрыяючага, засушлівага лета яны дабіліся рэкордных ураджаяў. Вось, напрыклад, стаханаўскае звяно калгаса „Чырвоны бераг", Аршанскага раёну, атрымала жыта 29,9 цэнтнераў з гектара, аўса—28 цэнтн., пшаніцы 26,2 цэнтн. Калгас „Чырвоны баец", Барысаўскага раёна, з плошчы 53 гектара сабраў па 210 цэнтн. бульбы. Яшчэ больш высокага ўраджаю дабіліся звенні таварышоў Шаршэні, Скакуна, Аляксеева з калгаса імя Варашылава, Барысаўскага раёна. Яны далі па 3500 пудоў з гектара. Звяно тав. Мінінай з калгаса „Май", Чачэрскага раёну, дабілася ўраджаю—13 цэнтн. ільнавалакна з гектара.

Побач з тым, што дэлегаты нарады дзяліліся вопытам сваёй работы, яны рэзка крытыкавалі раённыя і рэспубліканскія арганізацыі за дрэннае кіраўніцтва сельскай гаспадаркай.

Участковы аграном тав. Фамічова з Сенненскага раёна прад'явіла Наркому Земляробства тав. Бэнэку рахунак—лепш кіраваць спецыялістамі сельскай гаспадаркі, дапамагаць ім у іх канкрэтнай рабоце.

— Толькі на паперы Наркамзем кіруе намі і трымае з намі сувязь,—гаворыць тав. Фамічова.—Часта мы атрымоўваем ад розных аддзелаў Наркамзема па аднаму і таму-ж пытанню розныя дырэктывы, якія нас толькі блытаюць. Мы патрабуем такой дапамогі ў рабоце, якой ад нас патрабуюць калгасы.

Рад дэлегатаў у сваіх выступленнях гаварылі аб дрэнным кіраўніцтве стаханаўскім рухам. Звеннявая Марыя Рыбакова з калгаса імя Чарвякова, Мсціслаўскага раёна, кажа:

— Раённыя арганізацыі не дапамагаюць стаханаўцам у сельскай гаспадарцы. Пра нас забыліся. Кіраўнікі раёна—сакратар райкома партыі тав. Штэйнгардт, старшыня РВК тав. Рай—адарваліся ад мас, ад калгасаў. Яны не дапамагаюць брыгадзірам і звеннявым у іх рабоце, і вучобе.

Намеснік старшыні калгаса „Перамога", Дрысенскага раёна, тав. Абуховіч таксама адзначыла дрэнную работу раённых арганізацый у галіне кіраўніцтва калгасамі.

— Кіраўнікі раёна,—гаворыць тав. Абуховіч,—прыязджаюць у калгас, на хвілінку спыняюцца, накрычаць на старшыню калгаса або на членаў праўлення, абвінавацяць іх у дрэннай рабоце, і едуць далей. З калгаснікамі раённыя кіраўнікі ніколі не гутарылі.

Спынілася тав. Абуховіч на пытанні вылучэння жанчын на кіруючую работу на Дрысенскаму раёну.

— Хіба гэта нармальна,—кажа тав. Абуховіч,—што ў нас у раёне старшынёй сельсовета працуе толькі адна жанчына, а старшынь калгасаў зусім няма. Раённыя арганізацыі не выконваюць пастановы ЦК ВКП(б) аб вылучэнні жанчын.

Выступаючыя таварышы ўказвалі і на тое, што ў сувязі з перабудовай партыйнай работы некаторыя партарганізацыі не ўдзяляюць увагі гаспадарчым пытанням. Многія не зразумелі, што паварот к разгортванню партыйна-масавай работы не азначае адмаўлення ад кіраўніцтва сельскай гаспадаркай.

Цёпла сустрэлі ўдзельнікі нарады выступленне прадстаўніка дэлегацыі калгаснікаў Заходняй вобласці ордэнаносца тав. Фралова. Ён расказаў пра вынікі ўраджаю ў 1936 годзе, спыніўся на перспектывах на 1937 год. Адначасова тав. Фралоў перадаў жаданне калгаснікаў Заходняй вобласці працягнуць спаборніцтва з калгасамі Беларусі на 1937 год.

Дэлегаты горача падтрымалі тав. Фралова. Тут-жа на нарадзе была абрана камісія для выпрацоўкі праекта соцдагавора. Пасля зачыткі праекта, унясення дадаткаў і паправак камісія падпісала гэты дагавор.

Удзельнікі нарады ўзялі на сябе наступныя абавязацельствы: арганізаваць ільнаводчыя стаханаўскія звенні—2.000 па Беларусі, 3.000 па Заходняй вобласці. Сяўбу ільну закончыць у 5—7 дзён. Дабіцца ўраджаю ільнавалакна ў сярэднім 4—5 цэнтн. з гектара, а з насенаводчых участкаў 5—6 цэнтнераў. Забяспечыць атрыманне ўраджаю зернавых культур па 100 калгасах Беларусі—па 20 цэнтн. з гектара. Дабіцца ўраджаю бульбы ў сярэднім 140 цэнтн. з гектара і па 500 калгасах не менш 200 цэнтн.

Пасля падпісання дагавора ўдзельнікі нарады звярнуліся да ўсіх калгаснікаў і калгасніц БССР і Заходняй вобласці з заклікам—па-большэвіцку змагацца за арганізацыю соцспаборніцтва паміж асобнымі калгасамі, брыгадамі, звеннямі, паміж стаханаўцамі за выкананне ўзятых абавязкаў.

У канцы нарады з прамовай выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць павелічэння ўраджайнасці, на няўхільнае правядзенне ў жыццё Сталінскага статута сельгасарцелі, на масавую работу сярод аднаасобнікаў і ліквідацыю дапушчаных перагібаў. Тав. Шаранговіч паставіў рад задач у справе барацьбы за 7—8 мільярдаў пудоў зерна, за высокі ўраджай ільну, бульбы і іншых культур.

У нас маюцца ўсе магчымасці, каб дабіцца высокага ўраджаю ў 1937 годзе. На палях Беларусі ў гэтым годзе будзе працаваць 7.000 трактароў і многа іншых сельска-гаспадарчых машын. Дзяржава робіць усё, каб стымуляваць барацьбу за высокія ўраджаі і заможнае жыццё. Справа ў людзях.

Мы ўпэўнены, што жанчыны-калгасніцы будуць у першых радах бараньбітоў за Сталінскі ўраджай. Нашы калгасніцы добра ведаюць, што далейшае ўмацаванне калгасаў—гэта залог заможнага, культурнага і радаснага жыцця.

Пятроўская.

ТРАКТАРЫСТКІ

Жаночая трактарная брыгада Багушэўскай МТС у мінулым годзе выйшла на другое месца ў раёне.

Сёлета ў раёне замест адной брыгады арганізавана—3. Усе дзяўчаты ўключыліся ва ўсесаюзнае спаборніцтва жаночых трактарных брыгад. Трактарысткі Аня Трафімава, Даша Белая і Маня Жыгалава абавязаліся ў 1937 годзе ўзараць па 1000 гектараў кожная. Усе яны маладыя дзяўчаты, але прыкладныя ў рабоце.

Вось Аня Трафімава. Ёй толькі 18 год. Гэта звычайная дзяўчынка, а па рабоце на трактары яна лепшая ў брыгадзе. У мінулым годзе яна ўзарала 626 гектараў і за адну змену з'эканоміла 100 кілограмаў гаручага.

Аня Трафімава і ў гэту вясну выйшла ў поле арганізавана. За дзень яна ўзорвае 5—6 гектараў і норму перавыконвае ў паўтары разы...

Трактар Ані працуе на трэцяй хуткасці. Аня арганізавала работу такім чынам, што дапаможную работу выконваюць падсобныя людзі, а сама яна занята выключна работай на трактары. Трактар тав. Трафімавай не ведае прастояў.

— Асноўнае ў маёй рабоце,— гаворыць тав. Трафімава,—гэта тое, што я ведаю машыну. Працую з поўнаю нагрузкай. Калі здарыцца якая-небудзь паломка, я яе ліквідую на хаду. Дробны рамонт раблю заўсёды сама. Акрамя гэтага строга прытрымліваюся графіка папярэджальнага рамонту.

З вялікай павагай адносяцца дзяўчаты да Ані. Яны з ёю раяцца, дзеляцца сваімі радасцямі. Яна шчыры друг і таварыш дзяўчатам.

У полі і пасля работы ўсюды тав. Трафімава акружана дзяўчатамі. Аня то растлумачвае трактар, то расказвае што-небудзь з прачытанага ў газетах або кніжках, то весела спявае песні.

Так растуць новыя людзі. Так змагаюцца дзяўчаты-трактарысткі за рэкордныя паказчыкі ў рабоце на трактары, так змагаюцца за высокі сталінскі ўраджай.

Бохан.

Багушэўская МТС



Выезд у поле жаночай трактарнай брыгады Дзяржынскай МТС.
Фота Рытава (БСФ).

НЕДААЦЭНЬВАЮЦЬ ЖАНОЧУЮ СІЛУ

Веснавая сяўба на палях Беларусі ў поўным разгары. Для сканчэння сяўбы неабходна мабілізаваць усе сілы, усе сродкі. Але на жаль не ўсе кіраўнікі раёнаў і калгасаў зразумелі гэта. Не ўсё яшчэ на мясцах выкарыстоўваецца для выканання гэтай важнейшай задачы. Многія скардзяцца на недахоп рабочай сілы ў калгасах, у той час, як жанчыны-калгасніцы не ўцягнуты ў калгасную вытворчасць. Ім не дадзены ўмовы для работы ў полі. Ва многіх калгасах не адчынены калгасныя яслі.

Калгасніцы з калгасаў „Шлях да соцыялізма" і „Ленінскі шлях", Каменскага сельсовета, Бабруйскага раёна ў большасці не выходзяць на работу таму, што няма на каго пакінуць дзяцей.

Вельмі дрэнна абстаіць справа з арганізацыяй калгасных ясляў і ў Кіраўскім раёне. З адпушчаных 5600 рублёў на гэту справу, не выдаткавана ні адной капейкі.

Калгасу імя Карла Маркса штодзённа патрэбна на розныя сельскагаспадарчыя работы 80—100 жанчын, а выходзіць на работу 8—10, толькі таму, што няма ясляў. А ў калгасе ёсць і памяшканне, спецыяльна прызначанае для ясляў, але ў ім жыве намеснік старшыні калгаса тав. Яцкі.

У Кіраўскім раёне—100 калгасаў і ні ў адным не адчынены яслі. Старшыня Райвыканкома тав. Касцюк не жадае нават і гутарыць на гэту тэму.

Неабходна пакончыць з недаацэнкай жаночай сілы ў калгасах. Неабходна стварыць усе ўмовы для скарыстання на калгасных работах усіх працаздольных жанчын. Неабходна памятаць, што жанчыны ў калгасе—вялікая сіла.

Еўгенія Егорава.

Пяцігадовец да шчасця дацягнеш

Гаротнае было маё дзяцінства. Бацька мой памёр, калі мне было 7 год. Маці аддала мяне на выхаванне дзядзьку, сама яна не мела ні сродкаў, ні магчымасці выхоўваць нас. Ледзь толькі паднялася на ногі—пашла працаваць па чужых людзях. Як плацілі—цяжка ўявіць сабе зараз. Працавала за тое, што кармілі, плацілі натурай—аўсом і бульбай, было, што і зусім не плацілі, а скардзіцца не было каму. Ніхто за нас не заступаўся.

Замуж вышла маладая. Думала, жыццё пераменіцца, лягчэй жыць будзе. Але нічога не змянілася,—наадварот, клапот і галодных дзён прыбавілася. Пашлі дзеці, прыбаўляліся лішнія раты.

Але дачакаліся мы шчаслівага жыцця. Жыву я са сваімі дзецьмі радасна. Сама ўжо 5 год працую на чыгунцы і вучуся.

Дзяцей я маю сямёра. Старэйшаму ўжо 21 год, ён працуе настаўнікам у Маласітнянскім сельсавеце, Полацкага раёна. Ён мне ўжо дапамагае. Рыхтуецца пайсці ў Чырвоную армію. Я ганаруся, што мой сын у радах Чырвонай арміі будзе абараняць нашу цудоўную краіну.

Усе мае астатнія дзеці вучацца. Адзін у сёмым класе, два—у пятым, адзін у першым, двое рыхтуюцца ў школу, а пакуль што наведваюць дзіцячы сад.

Дзеці ў мяне жыццерадасныя, жывуць яны ў шчаслівую сталінскую эпоху. Ад шчырага сэрца прыношу таварышу Сталіну ўдзячнасць за шчаслівае жыццё і дапамогу, якую я атрымала на выхаванне дзяцей.

Я даю моцнае мацярынскае слова—усіх сваіх дзяцей выхаваць адданымі соцыялістычнай радзіме.

Анастасія Шаркевіч.

Полацк.

* * *

Жудасна ўспомніць, як жылі мы ўсе да рэволюцыі. Голад, беднасць, жыццё ў зямлянках,—вось жыццё большасці з нас. І песні нашы былі пакутныя, у іх мы спявалі тое, што перажывалі ў сапраўднасці.

Зусім іншым жыццём жывем мы цяпер. Вось узяць хаця-б мяне. Дзеці мае апрануты, абуты, жывуць добра і спадзяюцца жыць яшчэ лепш. Перад імі адчынены ўсе дарогі. Яны-ж могуць стаць кім толькі пажадаюць. Аб нас—жанчынах і нашых дзецях—клапоціцца самы блізкі чалавек—наш Сталін. Гэта па яго закону нам, шматсямейным, аказваецца дзяржаўная дапамога на выхаванне дзяцей. Гэта-ж па 2000 рублёў! Калі і якая дзяржава давала такую дапамогу? Ніколі!

Наша комуністычная партыя, наш совецкі ўрад далі нам такое шчаслівае жыццё.

Мая сям'я ў калгасе з 1930 года. Жывем мы заможна. За 1936 год выпрацавалі 1020 працадзён. Я таксама працавала на ферме—паіла 24 цялят, выпрацавала 400 працадзён. Атрымала прэмію—цёлку. Маю карову, траіх свіней, авечку і гадую бычка.

Ніколі я так і не марыла жыць, як жыву цяпер. Толькі совецкая ўлада, калгасны лад дапамог нам стаць людзьмі.

Зварачаюся да тых, хто яшчэ не ўступіў у калгасы, хто яшчэ на сёнешні дзень аднаасобнік, што хоціць ужо думаць, трэба ісці ў калгас, ісці па таму шляху, на які кліча нас партыя. Вось вам прыклад—я. Толькі ў калгасе жыццё маёй сям'і стала шчаслівым і радасным.

Міхаліна Чарней.

Ветрынскі раён.
Калгас „Палітаддзел"



Жонка рабочага Лазова-Паўлаўскай сапожнай майстэрні (Данбас) Г. В. Курылава нарадзіла трох хлопчыкаў. Тав. Курылавай 36 год, яна ўжо мае 2 сыноў 10 і 6 год. На здымку: дзяжурная акушэрка тав. Нікалаева ў пасцелі роджаніцы. (Саюзфото).

Пустыя калыскі

Рэзкае падзенне нараджальнасці, якое назіраецца ў капіталістычных краінах, выклікае немалую трывогу ў ваенных штабах і ў дзяржаўных канцылярыях Еўропы. Пытанне аб людскіх рэзервах, аб гарматным мясе стаіць з незвычайнай вастрынёй. Яно служыць крыніцай асаблівых клапот у фашысцкіх краінах. Увесь буржуазны друк удзяляе праблеме нараджальнасці велізарную ўвагу. „Пустыя калыскі"—загаловак, які ўсё часцей і часцей не зыходзіць са старонак буржуазных газет.

„У цяперашні час вельмі прыкметнае падзенне нараджальнасці, — піша ў перадавым „Дэйлі мейль",—стала паўсюднай з'явай у Еўропе. Калі гэта не спыніцца, то заходняй цывілізацыі пагражае страшэнная катастрофа".

За апошнія месяцы ў Англіі выйшлі тры салідныя працы, прысвечаныя праблеме народанасялення: „Барацьба за народанасяленне" Д. В. Гласа; „Рух народанасялення" Р. Р. Кучынскага і „Народанасяленне свету" А. М. Кар-Саундэрса. Англійскі часопіс „Спектэйтар", змяшчаючы падрабязную рэцэнзію на гэтыя кнігі, піша:

„Усе тры кнігі прыходзяць да здзіўляючага і важнага вываду. Хоць лік нараджэнняў усё яшчэ перавышае ў нашай краіне лік смерцяў і, трэба думаць, што гэтае перавышэнне будзе назірацца яшчэ на працягу некалькіх год, нараджальнасць настолькі ўпала, што прыходзіцца баяцца двух неўнік нёных вынікаў, калі не адбудуцца якія-небудзь радыкальныя перамены. Першы вынік звязан са зменай узроснага складу насельніцтва. Лік старых будзе расці, а лік маладых падаць. Але з гэтага выцякае неўнікнёна другі вынік: калі старыя пачнуць паміраць, вырасце смяротнасць, лік смерцяў пачне перавышаць лік нараджэнняў, ўрэшце пачне змяншацца агульная колькасць насельніцтва".

Эканамічны крызіс змяніўся дэпрэсіяй. У цэлым радзе краін узмоцнена крычаць з поваду „ажыўлення" і праслаўтага „росквіту". Але беспрацоўе не скарачаецца. Падзенне жыццёвага ўзроўню шырокіх працоўных мас дае сябе адчуваць. Фізічнае знясіленне, рост захворванняў, павелічэнне смяротнасці — такі адзін бок гэтага працэса. Другі—падзенне ліку шлюбаў, павелічэнне ліку разводаў і нязменнае скарачэнне нараджальнасці.

За апошнія 10—15 год прырост насельніцтва ва ўсіх краінах свету значна знізіўся. У фашысцкай Германіі, дзе дзяржаўныя мерапрыемствы, якія накіраваны на павелічэнне нараджальнасці, далі пакуль што малаадчувальны вынік, начальнік гестапо Гімлер з пенай у роце патрабуе „навагі да незамужніх мацераў". „Кіраўнік фашысцкага працоўнага фронта" Лей заклікае адкінуць „старамодны прадузяты погляд супроць незаконнанароджаных дзяцей" і прапануе адкрыць радзільныя дамы, дзе-б „з належнай увагай" даглядалі за незамужнімі мацерамі.

Сэнс „высокай фашысцкай маралі" надзвычайна просты. Гітлераўскай Германіі патрэбны салдаты, як мага больш салдат, для таго, каб „фюрэр" мог ажыццяўляць свае авантурыстычныя, захватніцкія планы. Фашысцкі друк, кіно, тэатры, школа, спартыўныя і іншыя арганізацыі вядуць самую энергічную прапаганду за нараджэнне дзяцей.

Але германская жанчына-маці ўсё ясней бачыць страшную перспектыву, якую рыхтуе фашысцкі рэжым яе дзецям. Іх чакае голад і беспрацоўе. Вось чаму ні фашысцкая прапаганда, ні некаторыя практычныя мерапрыемствы фашыстаў не далі істотных вынікаў.

„Ці можна спадзявацца,—піша Блэкер у „Спектэйтар",—што, чакаючы эканамічную дэпрэсію, якая выклікае велізарнае беспрацоўе, і ўлічваючы пагрозу новай еўрапейскай вайны, людзі рашацца мець дзяцей!"

Не менш песімістычна рысуе буржуазны друк перспектывы нараджальнасці ў Італіі. Мерапрыемствы Мусаліні не далі чакаемых вынікаў. Італьянская газета „Трыбуна" паспяшае даць „дучэ" новую параду. Газета ўгледжвае прычыну падзення нараджальнасці ў празмерным... навучанні.

„Людзі, якія дабіваюцца вучоных ступеняў,—піша газета,—вымушаны ўступаць у шлюб значна пазней іншых... Няма сумнення, што скарачэнне працягласці навучання для ўсіх служачых і чыноўнікаў было-б вялікай палёгкай Тысячы маладых людзей зрабіліся-б на некалькі год раней самастойнымі і маглі-б жаніцца..."

І далей газета шукае нейкія „маральныя" прычыны скарачэння нараджальнасці.

Аб „маральных" прычынах трактуе і цвердалобая „Морнінг пост" у перадавым пад загалоўкам „Нашы пустыя калыскі". Газета рашуча адвяргае залежнасць такой з'явы, як падзенне нараджальнасці, ад эканамічных прычын. „Гэта марксісцкая прывычка"—тлумачыць з'явы чалавечага жыцця прычынамі эканамічнага парадку—злоснічае газета.

Аб няўхільным падзенні нараджальнасці ў Францыі англійскія газеты гавораць як аб факце, супроць якога, відавочна, бескарысна было-б змагацца. „Што мне падабаецца ў Францыі—гэта тое, што ў ёй усё адбываецца на сто год раней, чым дзе-б то ні было",—іранізуе Мак Кліры ў артыкуле „Дамініёны без людзей", успамінаючы словы Гейне.

Дзевяць артыкулаў з нумару ў нумар прысвячае праблеме нараджальнасці англійскі „Спектэйтар". Часопіс абмяркоўвае пытанне з самых розных пунктаў погляду і прыходзіць да самых няўцешных вывадаў. Аўтары шматлікіх артыкулаў нават не прапануюць ніякіх сродкаў для барацьбы са злом.

„Па-першае,—піша ва ўпамянутай намі вышэй кнізе Глас,—рэпрэсіўныя меры наўрад ці могуць аказацца ў гэтых адносінах эфектыўнымі. Па-другое, толькі рабочы клас можа адыграць рашаючую ролю ў павелічэнні процанту нараджальнасці. Таму ніякія меры не могуць аказаць працяглага ўздзеяння, калі не будуць створаны ўмовы, пры якіх рабочы клас мог-бы выхоўваць сваіх дзяцей, не пакутуючы ў эканамічных і соцыяльных адносінах".

Так, іменна так стаіць пытанне. Загніваючы капіталістычны лад не ў стане забяспечыць нармальныя ўмовы для прадаўжэння здаровага чалавечага жыцця.

Скарочаны артыкул „Правды". **А. Барысава.**

АБВІНАВАЧВАННЕ РАЙКОМУ

У пачатку 1934 года на раённай партыйнай канферэнцыі мяне абралі членам райкома партыі. Я ўспрыняла гэта, як вялікае давер'е, аказанае мне партарганізацыяй, як вельмі адказны і пачэсны партыйны абавязак. Я член раённага камітэта партыі, а гэта значыць удзельнічаю ў кіраўніцтве раённай партыйнай арганізацыі і нясу за яе адказнасць.

Цяпер у нас праходзяць выбары парторганаў. Хутка будзе раённая партыйная канферэнцыя, дзе райком будзе рабіць справаздачу аб сваёй рабоце. І вось, я часта думаю над такім пытаннем: як член райкома партыі, што я зрабіла для партыйнай арганізацыі, ці апраўдала я аказанае мне давер'е?

Мала я зрабіла. У жыцці партыйнай арганізацыі нашай фабрыкі я, праўда, прымаю актыўны ўдзел. Я член парткома, паліт'інфарматар цэха, выконваю розныя заданні. Але я-ж член райкома, ад мяне патрабуецца больш, і я адчуваю, што магла-б і зрабіць больш.

Хто-ж вінаваты ў тым, што я не ўдзельнічала ў рабоце райкома? Вінавата не толькі я. З партыйнай арганізацыі нашай фабрыкі дзве жанчыны з'яўляюцца членамі райкома — я і Надзя Шапчыц, і абедзве мы не ўдзельнічаем у рабоце райкома. Нас і не прыцягвалі к рабоце. Запрашалі нас толькі на пленумы, а вядома, што яны склікаліся вельмі рэдка.

Прыкладна да жніўня 1936 года мне здавалася, што райком забыўся пра мяне. Але вось у газеце „Правда" з'яўляецца артыкул аб пасіўных членах райкома. Тады заварушыліся і ў нас.

Выклікаюць мяне ў райком. Думаю пагаворыць з намі сакратар райкома тав. Майсееў, запытае як мы жывем, дасць якое-небудзь даручэнне. Але вышла зусім не так. Сабраў нас інструктар райкома тав. Літвішка, пагутарыў і, праўда, даў невялікія даручэнні. Сакратары райкома і на гэты раз не ўдастоілі нас сваёй увагай. Так за ўвесь час мне ні разу не ўдалося пагаварыць з сакратарамі райкома.

Мне даручылі абследваць партарганізацыю друкарні. Я гэта зрабіла. Але як зрабіла, добра ці дрэнна, не ведаю. Ніхто аб гэтым мне не сказаў. Мела я яшчэ адно невялікае даручэнне і ўсё. Гэта за ўвесь час, больш чым за два гады. На гэтым заканчваецца ўся мая работа, як члена райкома партыі. Толькі ў апошнія дні мне даручылі правесці выбары партыйных органаў у двух пярвічных партарганізацыях.

А я адчуваю, што магла-б зрабіць значна больш. Я маю вялікі вопыт работы на вытворчасці. На нашай фабрыцы я працую з 1907 года. Я прышла сюды 10-гадовай дзяўчынкай, выпрабавала „асалоду" работы на фабрыкантаў Берманых і іншых. На нашай совецкай фабрыцы я вырасла да майстра змены. У партыі я з 1924 года. У кіруючыя партыйныя органы абіралася ўжо некалькі раз. Гэта жыццёвая і партыйная школа для мяне дарэмна не прайшла.

Партыйныя даручэнні, якія даваў мне партком, я заўсёды выконвала акуратна. Зусім незразумела, чаму бюро райкома не палічыла магчымым даваць мне якія-небудзь даручэнні, як члену райкома.

Бюро нашага райкома ў сваёй рабоце апіраецца толькі на невялікую групу кіруючых работнікаў, не заўважаючы, што тутжа на прадпрыемствах выраслі новыя, адданыя партыі комуністы. Гэта адна з буйнейшых памылак нашага райкома.

Мархель.

На здымку: начальнік шакаладнага цэха менскай фабрыкі „Комунарка"—інжынер-хімік тав. Б. В. Аллуй. (Белсаюзфото).

Барысаў, фабрыка імя Кірава.

ВЫШЭЙ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ!

ЯШЧЭ ШЧЫЛЬНЕЙ ЗГУРТУЕМ РАДЫ ВАКОЛ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА!

Маці

М. ГОРКІ

(Урывак з рамана)

Калі яна вышла на вуліцу і пачула ў паветры гул людскіх галасоў, трывожны, старожкі, калі яна ўбачыла ўсюды, у вокнах дамоў і каля брам гурты людзей, што праводзілі яе сына і Андрэя зацікаўленымі позіркамі,—у вачах у яе паўстала туманная пляма і завагалася, змяняючы колеры, то празрыста-зялёныя, то мутна-шэрыя.

З імі віталіся і ў вітаннях было нешта асаблівае. Слых яе лавіў адрывістыя, прыцішаныя заўвагі.

— Вось яны, ваяводы..

— Нам невядома, хто ваяводзіць...

— Ды я-ж нічога дрэннага не кажу!..

У другім месцы на дварэ нехта крычаў злосна:

— Пераловіць іх паліцыя,—яны і прападуць!..

— Лавіла!

Жаночае галашэнне спалохана неслася з акна на вуліцу.

— Апамятайся! Што ты халасты, ці што?

Калі праходзілі каля дома бязногага Зосімава, які атрымліваў з фабрыкі за сваё калецтва штомесячную дапамогу, ён, высунуўшы галаву з акна, закрычаў:

— Паўлік! Скруцяць табе галаву, шэльма, за твае справы, дажджэшся!

Маці ўздрыгнула, спынілася. Гэты крык выклікаў у ёй вострае пачуццё злосці. Яна зірнула ў друзлы, тоўсты твар калекі, ён схаваў галаву, лаючыся. Тады яна, паскорыўшы хаду, дагнала сына і, стараючыся не адставаць ад яго, пайшла следам за ім.

Павел і Андрэй, здавалася, не заўважалі нічога, не чулі воклічаў, якія праводзілі іх, ішлі спакойна, не спяшаючыся. Вось іх спыніў Міронаў, пажылы і сціплы чалавек, якога ўсе паважалі за яго цвярозае і чыстае жыццё.

— Таксама не працуеце, Даніла Іванавіч?—запытаў Павел.

— У мяне жонка цяжарная... Ну, і дзень такі, неспакойны!—растлумачыў Міронаў, разглядаючы пільна таварышоў, і паціху запытаў:

— Вы, хлопцы, кажуць, дырэктару нешта хочаце зрабіць, вокны біць яму?

— Хіба-ж мы п'яныя?—праказаў Павел.

— Мы проста пройдзем па вуліцы са сцягамі і песні будзем спяваць!—сказаў хахол.—Вось паслухайце нашых песень,—у іх наша вера!

— Веру вашу я ведаю!—задумна сказаў Міронаў.—Паперы гэтыя чытаў. Ба, Нілаўна!—крыкнуў ён, усміхаючыся маці разумнымі вачыма.—І ты бунтаваць пайшла?

— Трэба хоць перад смерцю поруч з праўдай пагуляць!

— Бач ты!—сказаў Міронаў.—Відаць, праўду пра цябе кажуць, што ты на фабрыку забароненыя кнігі насіла!

— Хто гэта кажа?—запытаў Павел.

— Ды ўжо—кажуць! Ну, бывайце, трымайцеся больш салідна.

Маці ціха засмяялася, ёй было прыемна, што пра яе гэтак гавораць. Павел сказаў ёй, усміхаючыся:

— Будзеш ты ў турме, мама!

Сонца ўзнімалася ўсё вышэй, уліваючы сваю цеплыню ў бадзёрую свежасць вясновага дня. Хмурынкі плылі марудней, цені іхнія зрабіліся танчэйшымі, больш празрыстымі. Яны мякка паўзлі па вуліцы і па дахах дамоў, акутвалі людзей і нібы чысцілі слабаду, абціраючы пыл і бруд са сцен і дахаў, тугу з твараў. Рабілася весялей, галасы гучэлі галасней, заглушаючы далёкі шум машын.

Зноў у вушы маці адусюль, з акон, з двароў паўзлі і ляцелі словы, трывожныя і злосныя, удумлівыя і вясёлыя. Але цяпер ёй хацелася спрачацца, дзякаваць, растлумачваць, хацелася ўмяшацца ў дзіўна стракатае жыццё гэтага дня.

За рогам вуліцы, у вузкім завулку, сабраўся натоўп чалавек у сто, а ў глыбіні яго гучэў голас Весаўшчыкова.

— З нас выціскаюць кроў, як сок з журавін!—падалі на галовы людзям нязграбныя словы.

— Правільна!—адказала некалькі галасоў адразу гучным гукам.

— Стараецца хлопец!—сказаў хахол.—А ну, пайду дапамагу яму!..

Ён сагнуўся, і не паспеў Павел спыніць яго, як ён ужо ўкруціў у натоўп, як каркаўнік у корак, сваё даўгое гнуткае цела. Прагучэў яго пявучы голас:

— Таварышы! Гавораць, на зямлі розныя народы жывуць—яўрэі і немцы, англічане і татары. А я гэтаму не даю веры! Ёсць толькі два народы, два племі непрымірлівых—багатыя і бедныя! Людзі розна апранаюцца і розна гавораць, а зірніце, як багатыя французы, немцы, англічане ставяцца да рабочага народу, дык і ўбачыце, што ўсе яны для рабочага—тыя самыя башыбузукі, костка ім у горла!

У натоўпе зарагатаў нехта.

— А з другога боку зірнем, дык убачым, што і француз рабочы, і татарын, і турак—гэткім-жа сабачым жыццём жывуць, як і мы, рускі рабочы народ!

З вуліцы ўсё больш падыходзіла народу, і адзін за адным людзі моўчкі, выцягваючы шыі, узнімаючыся на пальцах, уціскаліся ў завулак.

Андрэй узняў голас вышэй.

— За граніцай рабочыя ўжо зразумелі гэтую прастую рэч і сёння ў светлы дзень Першага Мая...

— Паліцыя!—крыкнуў нехта.

З вуліцы ў завулак проста на людзей ехала, махаючы бізунамі, чацвёра конных паліцэйскіх і крычалі:

— Разыйдзіся!

Людзі хмурыліся, неахвотна даючы дарогу коням. Некаторыя паўзлазілі на платы.

— Пасадзілі свіней на коней, дык яны і рохкаюць—вось і мы ваяводы!—крычаў нечы звонкі задзірысты голас.

Хахол застаўся адзін пасярод завулку, на яго, махаючы галовамі, наступалі два кані. Ён рушыў

у бок, і ў той-жа час маці. схапіўшы яго за руку, пацягнула за сабою, гаворачы:

— Абяцаў разам з Паўлікам, а сам лезеш на ражон адзін!

— Вінаваты!—сказаў хахол, усміхаючыся.

Нілаўну ахапіла трывожная, ламаючая стома, яна ўзнімалася знутры і кружыла галаву, дзіўна чаргуючы ў сэрцы тугу і радасць. Хацелася, каб хутчэй закрычаў гудок на абед.

Вышлі на плошчу, да царквы. Вакол яе, за агарожай, густа стаяў і сядзеў народ; тут было соцень з пяць вясёлай моладзі і дзяцей. Натоўп хваляваўся, людзі непакойна ўзнімалі галовы ўгару і заглядвалі ў даль, ва ўсе бакі, нецярпліва чакаючы. Адчувалася штосьці падвышанае, некаторыя глядзелі збянтэжана, другія прыкідаліся зусім бесклапотнымі. Ціха гучэлі прыцішаныя жаночыя галасы, мужчыны з незадавальненнем адварочваліся ад іх, часам гучэла ціхая лаянка. Глухі шум варожых спрэчак абнімаў стракаты натоўп.

— Змітручок!—ціха дрыжэў жаночы голас.— Пашкадуй сябе!..

— Адчапіся!—прагучэла ў адказ.

А паважны голас Сізава гучэў спакойна, пераканальна:

— Не, нам маладых кідаць не трэба! Яны зрабіліся разумнейшымі, чым мы, яны жывуць смялей! Хто балотную капейку абараніў? Яны! Гэта трэба памятаць! Іх за гэта па турмах цягалі,—а выйгралі ад гэтага ўсе...

Загудзеў гудок, праглынуўшы сваім чорным гукам людскі гоман. Натоўп уздрыгнуў, тыя, што сядзелі, усталі, на хвіліну ўсё замерла, настаражылася, і шмат твараў пабляднела.

— Таварышы!—прагучэў Паўлаў голас, гучны і моцны. Сухі гарачы туман абпаліў матчыны вочы, і яна адным рухам раптоўна памацнеўшага цела стала за сынам. Усе абярнуліся да Паўла, абкружаючы яго, нібі крупінкі жалеза кусок магніта.

Маці глядзела ў твар яму і бачыла толькі вочы, гордыя, смелыя, палкія...

— Таварышы! Мы вырашылі адкрыта заявіць, хто мы, мы ўзнімаем сёння наш сцяг, сцяг розуму, праўды і волі!

Дрэўка, белае і даўгое, мільганула ў паветры, нахілілася, разрэзала натоўп, схавалася ў ім, і праз хвіліну над узнятымі ўгору тварамі людзей узнялося чырвонай птушкай шырокае палатно сцяга рабочага народу.

Павел узняў руку ўгору—дрэўка пахіснулася, тады дзесятак рук схапілі белае гладкае дрэва, і сярод іх была рука яго маці.

— Няхай жыве рабочы народ!—крыкнуў ён.

Сотні галасоў адклікнуліся яму гулкім крыкам.

— Няхай жыве соцыял-дэмакратычная рабочая партыя, наша партыя, таварышы, наша духоўная радзіма!

Натоўп кіпеў, скрозь яго прабіваліся да сцяга тыя, хто зразумеў яго значэнне, поплеч з Паўлам станавіліся Мазін, Самойлаў, Гусевы, нахіліўшы галаву, рассоўваў людзей Нікалай, і яшчэ якіясьці незнаёмыя маці людзі, маладыя, з палкімі вачыма, адштурхвалі яе...

— Няхай жывуць рабочыя людзі ўсіх краін!— крыкнуў Павел. І ўсё растучы ў моцы і ў радасці, яму адказала тысячагалосае рэха, устрасаючы душу гукам.

Маці схапіла руку Нікалая і яшчэ чыесьці, яна захліпалася ад слёз, але не плакала, у яе дрыжэлі ногі, і дрыготнымі вуснамі яна гаварыла:

— Родныя...

Па рабым Нікалаевым твары расплылася ўсмешка, ён глядзеў на сцяг і мычэў нешта, працягваючы да яго руку, а потым раптам абхапіў маці гэтай рукою за шыю, пацалаваў яе і засмяяўся.

— Таварышы!—заспяваў хахол, пакрываючы сваім мяккім голасам гул натоўпу.—Мы пайшлі цяпер крыжавым ходам у імя бога новага, бога святла і праўды, бога розуму і дабра! Далёка ад нас наша мэта, цярновыя вянкі—блізка! Хто не верыць у сілу праўды, у якім няма смеласці да смерці стаяць за яе, хто не верыць у самаго сябе і баіцца пакут—адыходзь ад нас у бок! Мы клічам за сабою тых, хто верыць у перамогу нашу; тыя, што не бачаць нашу мэту—хай не ідуць з намі, гэткіх чакае толькі гора. Ў рады, таварышы! Няхай жыве свята вольных людзей! Няхай жыве Першае Мая!

Натоўп зліўся шчыльней. Павел узмахнуў сцягам, ён разгарнуўся ў паветры і паплыў над радам, асветлены сонцам, чырвона і шырока ўсміхаючыся...

„Отречемся от старого мира"...

— загучэў звонкі голас Фёдара Мазіна, і дзесяткі галасоў падхапілі мяккай моцнай хваляй:

„Отряхнем его прах с наших ног!"

Маці з гарачай усмешкай на вуснах ішла за Мазіным і праз галаву глядзела на сына і на сцяг. Вакол яе мільгалі радасныя твары, рознакалёрныя вочы—папарадзе ўсіх ішоў яе сын і Андрэй. Яна чула іхнія галасы—мяккі і вільготны Андрэеў голас зліваўся ў адзін гук з голасам сына яе, густым і басавітым.

„Вставай, подымайся, рабочий народ,
Вставай на борьбу, люд голодный!.."

І народ бег насустрач чырвонаму сцягу, ён нешта крычаў, зліваўся з натоўпам і ішоў з ім назад, і крыкі яго згасалі ў гуках песні, тае песні, якую ў хаце спявалі цішэй чым іншыя,—на вуліцы яна плыла роўна, моцна, са страшнай сілай. У ёй гучэла жалезная мужнасць, і, заклікаючы людзей у далёкую дарогу да будучыні, яна сумленна гаварыла пра цяжкасці шляху. У яе вялікім, спакойным полымі растапляўся цёмны шлак перажытага, цяжкі камяк прывычных пачуццяў, і згарала на попел праклятая баязлівасць новага...

Нечы твар, спалоханы і радасны, хістаўся каля маці і дрыжачы голас, усхліпваючы, ускрыкваў:

— Змітрок! Куды ты?

Маці, не спыняючыся, гаварыла:

— Хай ідзе,—вы не турбуйцеся! Я таксама дужа баялася, мой наперадзе ўсіх. Той, што нясе сцяг,—гэта мой сын!

— Разбойнікі! Куды вы? Салдаты там!

І раптам, схапіўшы матчыну руку касцістай рукою, жанчына, высокая і сухая, крыкнула:

— Любая вы мая,—спяваюць як! І Змітрок спявае...

— Вы не турбуйцеся!—мармытала маці.—Гэта святая справа. Вы падумайце—і хрыста-ж не было-б, калі-б дзеля яго людзі не гінулі.

Гэтая думка раптоўна загарэлася ў яе галаве і ўразіла яе сваёй яснай, простай праўдай. Яна зірнула ў твар жанчыны, якая моцна трымала яе руку, і паўтарыла, здзіўлена ўсміхаючыся:

— Не было-б хрыста, калі-б людзі не загінулі дзеля яго, дзеля госпада!

Поруч з ёй з'явіўся Сізаў, ён зняў шапку, махаў ёю ў такт песні і гаварыў:

— Адкрыта пайшлі, маці, га? Песню прыдумалі. Якая песня, маці, га?

„Царю нужны для войска солдаты,
Отдавайте ему сыновей"...

— Нічога не баяцца!—гаварыў Сізаў.—А мой сынок у магілцы...

Матчына сэрца забілася занадта моцна, і яна пачала адставаць. Яе адштурхнулі ў бок, прыціснулі да плоту, паўз яе, калышучыся, паплыла густая хваля людзей—іх было шмат, і гэта радавала яе.

„Вставай, подымайся, рабочий народ"...

Мроілася, у паветры спявае вялізная мядзяная труба, спявае і абуджае людзей, выклікаючы ў адных грудзях імкненне да бою, у другіх невыразную радасць, прадчуванне чагосьці новага, пякучую цікавасць, там—узбуджаючы смутнае трапятанне надзей, тут—адчыняючы выхад едкаму струменю назбіранай праз гады злосці. Усе пазіралі наперад, дзе хваляваўся і лунаў у паветры чырвоны сцяг.

— Пайшлі!—роў нечы захоплены голас.—Слаўна, хлопцы!



І, відаць, адчуваючы нешта вялікае, чаго не мог выказаць звычайнымі словамі, чалавек лаяўся моцнай лаянкай. Але і злосць, цёмная, сляпая злосць нявольніка, сычэла змяёю, круцячыся ў злосных словах, устрывожаная святлом, што пала на яе.

— Ерэтыкі!—грозячы кулаком, крычаў з акна надарваны голас.

І назойліва лез у вушы маці нечы прарэзлівы віск:

— Проці гасудара імператара, проці яго вялікасці цара? Бунтаваць?

Паўз маці мільгалі збянтэжаныя твары, прабягалі мужчыны, жанчыны, ліўся народ цёмнай лавай за гэтай песняй, што напорам гукаў, здавалася, звальвала перад сабою ўсё, расчышчаючы дарогу. Пазіраючы на чырвоны сцяг удалечыні, яна не бачачы—бачыла сынаў твар, яго бронзавы лоб і вочы, што гарэлі яркім агнём веры.

Але вось яна ў хвасце натоўпу, сярод людзей, якія ішлі, не спяшаючыся, абыякава зазіраючы наперад, з халоднай цікаўнасцю гледачоў, якія наперад ведаюць, чым скончыцца відовішча. Ішлі і гаварылі паціху, упэўнена.

— Адна рота ля школы стаіць, а другая ля фабрыкі...

— Губернатар прыехаў...

— Праўда?

— Сам бачыў,—прыехаў!

Нехта радасна вылаяўся і сказаў:

— Усё-ж такі баяцца пачалі нашага брата! І войска, і губернатар.

„Родныя!"—білася ў грудзях маці.

Але словы вакол яе гучэлі мёртва і холадна. Яна прыспешыла хаду, каб адыйсці ад гэтых людзей, і ёй лёгка было апярэдзіць іхны марудны, ляны ход.

І раптам галава натоўпу нібы ўдарылася аб штосьці, цела яго, не спыняючыся, падалося назад з трывожным ціхім гулам. Песня таксама ўздрыгнула, потым палілася шпарчэй, галасней. І зноў густая хваля гукаў папаўзла назад. Галасы выпадалі з хору адзін за адным, чуліся паасобныя воклічы, якія намагаліся ўзняць песню на ранейшую вышыню, падштурхнуць яе наперад:

„Вставай, подымайся, рабочий народ!
Иди на врага, люд голодный"...

Але не было ў гэтым закліку агульнай, злітай упэўненасці, і ўжо дрыжэла ў ім трывога.

Не бачачы нічога, не ведаючы, што здарылася наперадзе, маці расштурхвала натоўп, шпарка прасоўваючыся наперад, а насустрач ёй вярталіся назад людзі: адны—нахіліўшы галовы і нахмурыўшы бровы, другія саромліва ўсміхаючыся, трэція з кплівым свістам. Яна тужліва ўглядалася ў іхнія твары, яе вочы моўчкі пыталіся, прасілі, клікалі...

— Таварышы!—прагучэў Паўлаў голас.—Салдаты гэткія-ж людзі, як і мы. Яны не будуць біць нас. За што біць? За тое, што мы нясем праўду, якая патрэбна ўсім? Гэтая-ж праўда і ім патрэбна. Пакуль яны не разумеюць гэтага, але ўжо недалёка той час, калі яны паўстануць поруч з намі, калі яны пойдуць не пад сцягам рабункаў і забойстваў, а пад нашым сцягам волі. І для таго, каб яны зразумелі нашу праўду хутчэй, мы павінны ісці наперад. Наперад, таварышы! Заўжды—наперад!

ЦАНА 20 кап.

З гэтым нумарам бясплатна дасылаецца ўкладка-выкрайка

037

Парк культуры і адпачынку ў Батумі—улюбёнае месца школьнай дзетвары.
На здымку: вучні 2-га класа армянскай школы № 14 Аннаіда Агабагян і Маргарыта Шадоян ля ўвахода ў парк.

Фото В. Башкірава. (Саюзфота)

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск. Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 527. Тыраж 96209 экз. Галоўлітбел № 2151.
Здана ў набор 13/IV—37 г. Падпісана да друку 22/IV—37 г. У нумары 2½ арк. 10.100 друк. знакаў.